■ А вы ведалі?

# ЗЛАМАЎ НАГУ — ПЛАЦІ ПАДАТАК НА ГІПС!

## Самыя недарэчныя падаткі ў свеце

**Бенджамін Франклін казаў: «У гэтым свеце непазбежныя толькі смерць і падаткі...» Гісторыя навучыла нас, што падаткамі можна абкласці практычна ўсё, што заўгодна, хоць гэта не заўсёды прыносіць станоўчыя вынікі. Практычна ў кожнай краіне можна знайсці падаткі, якія могуць выклікаць і здзіўленне, і абурэнне, і рогат, а то і ўсё разам. Паглядзім?**

### БЕЛЬГІЯ: БАРАЦЬБА З ПАЦЯПЛЕННЕМ

У 2007 годзе мясцовыя ўлады Валоніі, у якой пражывае каля 3,5 мільёна чалавек, вырашылі абкласці падаткам прыгатаванне страў на грылі для барацьбы з... глабальным пацяпленнем. Лічыцца, што падчас прыгатавання ежы такім спосабам у атмасферу трапляе ад 50 да 100 грамаў парніковых газаў. Таму кожны жыхар гэтага рэгіёна Бельгіі, перш чым распаліць у двары барбекю, павінен цяпер ўнесці плату ў памеры 20 еўра. Вы, напэўна, адразу ж падумалі: «Ну, і як яны праверыць, раблю я грыль ці не?» Аднак улады Валоніі ставяцца вельмі сур'ёзна да праверкі выканання гэтага закона, а дапамагаюць ім у гэтым верталёты з цеплавізійнымі камерамі.



### ЗША: КЛОПАТ ПРА ЗДАРОЎЕ

Урад ЗША вырашыў у чарговы раз паклапаціцца пра здароўе сваіх грамадзян. Адным з элементаў рэформы аховы здароўя, якая праводзіцца з 2007 года, стала ўвядзенне падатку на загар у салярыі. Сёння кожны амерыканец, які хоча змяніць колер сваёй скуры, вымушаны плаціць дадатковую плату ў памеры 10 працэнтаў ад кошту паслугі.

### ЭСТОНІЯ: АБАРОНА ПАВЕТРА

Гэта, безумоўна, адзін з самых абсурдных падаткаў, пра які вы калі-небудзь пачуеце. У 2008 годзе ўрад Эстоніі прыняў рашэнне аб увядзенні новага падатку для заводчыкаў кароў. На думку чыноўнікаў, гэтыя жывёлы сваімі газамі моцна забруджваюць паветра. Цікава, але дадзены падатак не крануў заводчыкаў іншых жывёл, якія таксама ўносяць свой «немалы ўклад» у выглядзе выкідаў газаў, што маюць парніковы эфект.

### ПАР: ВУЧЫЦЦА І ВУЧЫЦЦА

Такім падаткам у ПАР абклалі ўсіх прадпрымальнікаў, у якіх ёсць наёмныя работнікі. Стаўка падатку — 1 працэнт ад заробку ўсіх супрацоўнікаў. Яго мэта — палепшыць развіццё прафесійных навыкаў работнікаў, асабліва сярод чорнага насельніцтва.

### ГРЭЦЫЯ: БАРАЦЬБА З РАСКОШАЙ

У Грэцыі басейн у двары прыватнага дома лічыцца раскошай. Таму кожны ўладальнік дома з басейнам абавязаны заплаціць падатак у памеры каля 800 еўра ў год. Многія жыхары Афінаў, якія не хочуць плаціць гэты падатак, хаваюць свае басейны пад брызентам колеру травы.

### АЎСТРЫЯ: КАТАЙЦЕСЯ БЕЗ ТРАЎМ

Аўстрыйскія Альпы — гэта ідэальнае месца для тых, хто любіць катацца на лыжах і снаўбордзе. Але праз гэта ж у краіне штогод каля 150 тысяч аматараў трапляюць у аўстрыйскія бальніцы з пераломамі і іншымі траўмамі. З гэтай прычыны ўлады вырашылі ўвесці для турыстаў так званы падатак на гіпс, які збіраюць уладальнікі гатэляў і пансіянатаў.

### БАЛЕАРСКІЯ АСТРАВЫ: СОНЦА ЗАРАЗ ДАРАГОЕ

Падатак на сонца абавязаны плаціць усе турысты, якія прыязджаюць на Маёрку, Менорку і іншыя Балеарскія астравы. Плата невысокая, усяго 1 еўра штодзень. Сабраныя грошы мясцовыя ўлады выдаткоўваюць на паляпшэнне турыстычнай інфраструктуры. Дарэчы, у 2012 годзе Балеары наведала больш за 10 мільёнаў турыстаў, так што паступленні ад гэтага падатку — гэта нядрэнная крыніца даходаў мясцовага бюджэту.

### КІТАЙ: ПАЛАЧКІ ГУБЯЦЬ ДРЭВЫ

Штогод у Кітаі выкарыстоўваецца для ежы каля 45 мільярдаў аднаразовых палачак, для вытворчасці якіх высякаецца 25 мільёнаў дрэў. З гэтай прычыны ўлады вырашылі ўвесці спецыяльны 5-працэнтны падатак пры куплі аднаразовых бамбукавых палачак для ежы. Гэта зроблена для таго, каб насельніцтва больш ахвотна выкарыстоўвала шматразовыя палачкі, зробленыя з пластыка. Але традыцыі для кітайцаў важнейшыя, чым эканамічная мэтазгоднасць.

### ВЕНЕЦЫЯ: ПРЫБЯРЫЦЕ ЦЕНЬ

У 1993 годзе ўлады Венецыі вырашылі абкласці падаткам уладальнікаў рэстаранаў і невялікіх крам, нерухомасць якіх кідае цень на тэрыторыю, што належыць гораду. Пасля ўвядзення «ценявога падатку» шматлікім уладальнікам месцаў гандлю і харчавання давялося дэманціраваць розныя прыстасаванні (навесы, маркізы) са сцен сваіх будынкаў.

### ВЕНГРЫЯ: ХАРЧУЙЦЕСЯ ПРАВІЛЬНА

«Чыпсавы падатак» уступіў у сілу ў Венгрыі з 1 верасня 2011 года. Ім абкладаецца розная расфасаваная ежа, такая як чыпсы, салёные печыва, салодкае печыва, піражкі ў ўпакоўцы, а таксама энергетычныя напоі. Такім чынам урад Венгрыі хоча зрабіць харчаванне венгерскіх грамадзян больш здаровым ■

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.08 | 20.13 | 14.05 |
| Віцебск — | 5.55 | 20.05 | 14.10 |
| Магілёў — | 5.58 | 20.03 | 14.05 |
| Гомель — | 5.58 | 19.57 | 13.59 |
| Гродна — | 6.24 | 20.27 | 14.03 |
| Брэст — | 6.28 | 20.25 | 13.57 |

**Месяц**

*Поўня 29 жніўня.*
*Месяц у сузор'і Рака.*

**Імяніны**

***Пр.*** *Аляксея, Аркадзя, Васіля, Мікалая, Уладзіміра, Фёдара.*
***К.*** *Монікі, Цэзара, Юзафа.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

**27 ЖНІЎНЯ**

**1919** год — савецкі ўрад прыняў дэкрэт аб нацыяналізацыі ўсёй кінасправы ў краіне. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі расійская кінапрадпрыемствы яшчэ каля двух гадоў працягвалі знаходзіцца ў прыватных руках. Большасць іх уладальнікаў адмоўна ставіліся да бальшавікоў. У першыя дні савецкай улады яны адмаўляліся выдаваць камеры і плёнку кінаапаратарам, якія жадалі захаваць для гісторыі рэвалюцыйныя падзеі. У адным толькі 1918 годзе прыватныя кінафірмы паставілі каля 150 фільмаў. Асноўную іх масу складалі мясцічковыя стужкі, любоўныя меладрамы, гістарычныя і іншыя карціны. Падчас грамадзянскай вайны, па меры нарастання голаду і разрухі, мноства рускіх кінематаграфістаў пакінулі Маскву і Петраград і пераехалі на поўдзень — у Адэсу і Крым, адкуль нярэдка эмігрыравалі на захад, везучы з сабой фільмы і здымачную апаратуру. У той жа час Ленін адзначаў, што кіно з'яўляецца найважнейшым мастацтвам, магутным прапагандысцкім інструментам, а іншыя кіраўнікі савецкай дзяржавы заклікалі «ўзяць кінематограф у свае рукі». Кінематаграфісты, якія падтрымлівалі савецкую ўладу, здымалі ў гэты час у асноўным хранікальныя фільмы пра рэвалюцыю і грамадзянскую вайну або мастацкія кінагіткі. 27 жніўня 1919 года быў выдадзены Дэкрэт Савета Народных Камісараў аб нацыяналізацыі кінасправы. З гэтага часу ўся фота- і кінематаграфічная прамысловасць і адпаведны гандаль перайшлі ў падпарадкаванне Народнага камісарыята асветы, які ўзначальваўся Анатолем Луначарскім. У памяць аб гэтай падзеі Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 25 красавіка 1979 г. было ўстаноўлена, што 27 жніўня з'яўляецца Днём савецкага кіно.

**1860** год — 155 гадоў таму нарадзіўся (вёска Станькава Дзяржынскага раёна) Карл Эмерыкавіч Чапскі, адзін з прадстаўнікоў старажытнага роду Гутэн-Чапскіх. У 1882 годзе скончыў Дзерпцкі (Тартускі) універсітэт. У 1890-1901 гадах — гарадскі галава ў Мінску. Узначальваў многія грамадскія і дзяржаўныя арганізацыі. Адкрыў у Мінску прытулак, шпіталь, амбулаторыю, пусціў электрастанцыю, трамвай, забрукаваў вуліцы. Садзейнічаў адкрыццю ў горадзе Таварыства аматараў спорту (з 1892-га — яго старшыня), Таварыства аховы жанчын, гарадское крэдытнае таварыства. Быў актыўным членам Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі. Пабудаваў піўзавод «Багемія», прададзены пасля сямейству Лекертаў. Памёр у 1904 годзе.



**1945** год — 70 гадоў таму нарадзіўся (вёска Звяняцкае Хойніцкага раёна) Генадзь Мікалаевіч Здор, беларускі вучоны ў галіне апрацоўкі матэрыялаў і тэхналогіі машынабудавання, доктар тэхнічных навук (1999), прафесар. У 1967 годзе скончыў БДУ. Аўтар навуковых прац па асновах праектавання тэхналагічных працэсаў фармаўтварэння тонкаліставых матэрыялаў імпульснымі нагрузкамі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1980).

**Было сказана**

**Сяргей ГРАХОЎСКІ, паэт:**

*У кожнага — адзіная дарога*
*Ад метрыкі да некралога,*
*А паміж імі, як заўжды, —*
*Хвіліны радасці і горычы гады...*

## УСМІХНЕМСЯ

**Распрацаваны самы грозны папераджальны дарожны знак: «Увага! Інспектар узяў іпатэку!»**

— Красуня, дай нумар тэлефона!
— Малады чалавек, пішыце — 0695671230.
— Ого, так адразу...
— Пішыце, пішыце, не саромейцеся. Патэлефануеце сёння ўвечары роўна ў шэсць. У сем сустракаемся на вячэры, я пазней есці не люблю. Сёння сексу не будзе — рана. Вазьміце грошы — я люблю крабаў. Кветак не трэба, сэканоміце. Заўтра можна секс. Я люблю зверху. Паўгода вам дастаткова? Мне нельга цягнуць з дзецьмі, ды і вам таксама. Хлопчык, потым дзяўчынка. Я растаўсцею, вы палысееце. Вы пойдзеце да суседкі, а я адбяру вашу кватэру.
— Вось дурная.
— Лепш выдаткаваць дзве хвіліны, чым дваццаць гадоў.

**Хочаш выхаваць сілу волі? Паспрабуй з'есці толькі адну семачку.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, нясуць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.022. Індэкс 63850. Зак. № 3310.
Нумар падпісаны ў 19.30 26 жніўня 2015 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12